ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 278 (1245) АЎТОРАК, 2-га сьнежня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

„Чырвоную Зьмену“—у масы

Нават ня ведаюць аб пяцідзёнцы

Колектыў ЛКСМБ міліцыі (Менск) нават ня ведае, што зараз па організацыі праводзіцца ўдарная пяцідзёнка „паходу за газэту“. У справе ўзбраеньня комсамольцаў газэтай да зьезду нічога ня робіцца. Шмат комсамольцаў зусім ня выпісваюць „Чырвонай Зьмены“.

Шк.

Нязначны зрух

Комсамольскі к-тыў Менскага Політэхнікуму да апошняга часу нічога не рабіў, каб прасунуць у масы „Чырвоную Зьмену“.

За апошні час у гэтым напрамку адчуваецца зрух, але яшчэ ня значны. Толькі ў апошнія дні к-тыў пачаў весьці працу па распаўсюджваньню „Чырвонай Зьмены“ сярод комсамольцаў.

В.

ЗАБЯСЬПЕЧЫМ СТОПРОЦАНТНЫ УДЗЕЛ ВЫБАРШЧЫКАЎ У ПЕРАВЫБАРАХ САВЕТАЎ

Дамо руйнуючы адпор кулацтву і яго агэнтуры—правым і „левым“ ухілістым

Яшчэ большым узмацненьнем органаў пролетарскай дыктатуры адкажам на контррэволюцыйныя дзеяньні шкоднікаў інтэрвэнтаў

Да ўсіх рабочых, колгасьнікаў, батракоў, бядняцка-серадняцкага сялянства і ўсіх працоўных

1 сьнежня пачынаецца па БССР справаздачна-перавыбарчая кампанія саветаў. У час кампаніі працоўныя Савецкага Саюзу падвядуць вынікі пасьпяховага соцыялістычнага будаўніцтва, якія дасягнуты, пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі (бальшавікоў) у рашучай барацьбе з капіталістычнымі элемэнтамі. Гэтыя дасягненьні мобілізуюць сілы працоўных мас для далейшай работы, для заваяваньня новых большых перамог на фронце соцыялістычнага будаўніцтва.

Таварышы! Політыка няўхільнай соцыялістычнай індустрыялізацыі краіны, усямернае ўзмацненьне саюзу пролетарыяту з асноўнымі масамі сялянства, рост савгаснага і колгаснага будаўніцтва на вёсцы, рашучая барацьба з кулацтвам на вёсцы і буржуазіяй у горадзе забясьпечыла разгорнутае наступленьне соцыялізму па ўсім фронце, непамерна павялічыла сілы пролетарыяту, павярнула серадняцкія масы сялянства на соцыялістычны шлях і выклікала магутны суцэльнай колектывізацыі.

Будуючы сваімі ўласнымі сродкамі соцыялізм, даючы бязьлітасны адпор клясавым ворагам, рабочая кляса ў саюзе з асноўнымі масамі сялянства узмацняе дыктатуру пролетарыяту, пасьпяхова вырашае пытаньне „хто-каго“ і набліжае канчатковую перамогу соцыялізму.

Пасьпяховае выкананьне лёзунгу партыі „пяцігодка—за 4 гады“ яшчэ больш умацоўвае позіцыі соцыялізму, колектывізацыя дробных сялянскіх гаспадарак яшчэ больш умацоўвае савецкую ўладу і дае з колгасьнікаў шматмільённую сапраўдную і надзейную апору рабочае клясы на вёсцы для пабудовы соцыялістычнай сельскай гаспадаркі, для яшчэ больш пасьпяховай і канчатковай барацьбы з заклятым ворагам соцыялізму—кулацтвам.

Посьпехі будаўніцтва соцыялістычнай дзяржавы выклікаюць шалёную злосьць клясавых ворагаў, як унутры СССР, гэтак і замежнай контррэволюцыі.

Разгорнутае соцыялістычнае будаўніцтва зьнішчае ў краіне рэшткі капіталістычных клясаў, якія перад сваёй пагібельлю напружваюць усе сілы, шукаюць дапамогі ад сусьветнага імпэрыялізму, каб затрымаць і перашкодзіць гістарычнаму наступу соцыялізму па ўсім фронце.

Выкананьне генэральнай лініі партыі, якая забясьпечвае экономічную незалежнасьць СССР ад капіталістычнага сьвету, рэволюцыянізуючае значэньне першай у сьвеце рэспублікі саветаў выклікае ліхаманкавую падрыхтоўку сусьветнага імпэрыялізму да ўзброенага контррэволюцыйнага нападу на Савецкі Саюз. Гэта падрыхтоўка на чале з урадам Францыі асабліва ўзмацнілася за апошнія часы.

Барацьба з савецкім экспортам, фашызацыя шэрагу суседніх буржуазных краін, падтрыманьне контррэволюцыйнай „прамысловай партыі“—усё гэта яскравыя паказчыкі падрыхтоўкі вайны супроць нас.

Ня гледзячы на шалёную антысавецкую кампанію і провокацыі міжнародных бандытаў капіталу, контррэволюцыйныя вылазкі шкодніцкіх элемэнтаў унутры Саюзу, савецкая ўлада вядзе непахісную політыку міру, якая забясьпечвае пасьпяховае будаўніцтва соцыялізму. Аднак, разам з тым, працоўныя СССР ва ўмовах ваеннай небясьпекі, якая ўсё павялічваецца павінны яшчэ больш узмацніць абароназдольнасьць краіны, баяздольнасьць сваёй Чырвонай арміі і рыхтавацца да руйнуючага адпору сусьветным імпэрыялістым.

Таварышы!

Бурны рост прамысловасьці, зьнішчэньне беспрацоўя, паварот асноўных мас сялянства да соцыялізму, суцэльная колектывізацыя шэрагу раёнаў СССР, ліквідацыя кулацтва, як клясы, творчы энтузіязм рабочых мас, за якімі ідзе бядняцка-серадняцкае сялянства, масавы рух пролетарыяту за новыя, сапраўды соцыялістычныя формы працы, дасягненьне мэтодамі соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва шпаркіх бальшавіцкіх тэмпаў работы характарызуе сучасны пэрыод соцыялізму, у які ўвайшоў СССР.

Гэта ставіць новыя задачы перад саветамі, як органамі дыктатуры пролетарыяту.

Праведзеная ліквідацыя акруг пераносіць цэнтр цяжару работы ў раён, які зараз зьяўляецца асноўным цэнтрам соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі. Таму ў справаздачна-перавыбарчую кампанію саветаў неабходна прыняць сапраўды рэальныя меры па ўзмацненьню раённых выканаўчых камітэтаў і с-саветаў, забясьпечыўшы правядзеньне імі цьвёрдай пролетарскай лініі ва ўсёй практычнай дзейнасьці, ператвараючы саветы ў сапраўды кіруючыя цэнтры пролетарскай дыктатуры.

Сельскія саветы яшчэ не зрабілі рашучага пералому па перабудове ўсёй сваёй работы і не павярнуліся тварам да колгаснага будаўніцтва, яны не ўсюды зьявіліся застрэльшчыкамі і організатарамі новай хвалі прыліву ў колгасы. Сельсаветы павінны стаць на чале новага прыліву працоўнага сялянства ў шэрагі колгасьнікаў, забясьпечыўшы ўпартай штодзённай організацыйна-гаспадарчай масавай работы выкананьне лёзунгу партыі аб суцэльнай колектывізацыі СССР да канца пяцігодкі.

У час справаздачна-перавыбарчай кампаніі неабходна ўзяць пад абстрэл бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі работу Саветаў і асобных дэпутатаў.

Аб рабоце Саветаў трэба судзіць па тым, як Саветы павярнуліся тварам да забясьпечаньня бесьперапыннай работы нашай прамысловасьці, ці сталі Саветы сапраўднымі застрэльшчыкамі і організатарамі колгаснага будаўніцтва, як праводзіцца барацьба з бюрократызмам, якую ролю саветы адыгрываюць у справе палепшаньня дабрабыту рабочых і наколькі Саветы праводзяць правільную клясавую лінію.

Саветы павінны стаць на чале разгорнутага соцыялістычнага будаўніцтва, праводзіць цьвёрдую пролетарскую лінію ва ўсёй рабоце, організоўваць масы і, вядучы бязьлітасную барацьбу з ворагамі дыктатуры пролетарыяту, быць сапраўднымі кіраўнікамі пераможнага будаўніцтва соцыялізму.

Савецкая Беларусь за апошнія гады мае буйнейшыя дасягненьні. Пры актыўнай дапамозе СССР прамысловасьць БССР разьвіваецца шпаркімі тэмпамі, пасьпяхова праходзіць соцыялістычная перабудова сельскай гаспадаркі, разгортваецца культурнае будаўніцтва.

Гэтыя дасягненьні працоўныя БССР атрымалі ў жорсткіх баёх з кулацтвам на вёсцы і нэпманамі ў горадзе, дзякуючы творчай актыўнасьці рабочае клясы, якая, пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі, гэроічнымі намаганьнямі выконвае і перавыконвае пляны соцыялістычнага будаўніцтва, даючы руйнуючы адпор усім праціўнікам генэральнай лініі партыі Леніна.

Саветы павінны няўхільна ісьці па шляху ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай політыкі. Разьвіваючы прамысловасьць і сельскую гаспадарку, пасьпяхова разгортваючы культурнае будаўніцтва — нацыянальнае па форме, пролетарскае па зьместу—і тым самым працягваючы політыку зьнішчэньня матар'яльнай і культурнай адсталасьці БССР—Саветы павінны даваць рашучы адпор усякаму шовінізму, з чыйго-б боку і пад якой бы маскай ён ні выступаў. Найбольшую небясьпеку на даным этапе прадстаўляе вялікадзяржаўны шовінізм, які імкнецца сарваць работу па пасьпяховаму вырашэньню нацпытаньня ва ўсім Саюзе і ў БССР.

Як і раней, няўхільна павінна праводзіцца бязьлітасная барацьба з беларускім контр-рэволюцыйным нацыянал-дэмократызмам, які грае на руку інтэрвэнтам. Рашучы адпор павінны сустрэць усякія вылазкі шовінізму яўрэйскага, літоўскага, польскага і іншых. Рабочыя, колгасьнікі, бядняцка-серадняцкія масы вёскі павінны згрупавацца навокал Саветаў у іх барацьбе за інтэрнацыянальнае адзінства супроць нацыяналізму і шовінізму ўсіх масьцей.

Таварышы! Справаздачна-перавыбарчая кампанія гэтага году набывае выключна важнае значэньне. Ад усіх працоўных патрабуецца самы актыўны ўдзел у правядзеньні кампаніі. Непасрэдны пэрыод пабудовы соцыялізму, узмоцненая пагроза ваеннай небясьпекі, жорсткая клясавая барацьба патрабуе ад працоўных яшчэ большай актыўнасьці, клясавай пільнасьці і рашучай барацьбы за баяздольныя і загартаваныя ў клясавых баёх органы пролетарскай дыктатуры.

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б заклікае рабочых, колгасьнікаў, батракоў, бядняцка-серадняцкае сялянства, членаў профсаюзаў да актыўнага ўдзелу ў правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі, на выкананьне бальшавіцкімі тэмпамі заданьняў ударнага кварталу і падрыхтоўкі да 3-га году пяцігодкі, на далейшае разгортваньне колектывізацыі, на руйнуючы адпор капіталістычным элемэнтам.

Комсамольцы і ўся рабоча-сялянская моладзь павінны прыняць актыўны ўдзел у справаздачна-выбарчай кампаніі Саветаў, стаць застрэльшчыкамі соцыялістычных мэтадаў яе правядзеньня. ЦК КП(б)Б ставіць перад комсамолам, як вернай зьменай бальшавіцкай партыі, задачу дапамагчы партыйным організацыям найбольш пасьпяхова правесьці выбары ў саветы і вылучыць на работу ў саветы лепшых комсамольцаў, здольных рашуча і да канца ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі.

ЦК КП(б)Б заклікае масы працоўных жанчын прыняць актыўны ўдзел у перавыбарах Саветаў, прыняць ўдзел у справаздачна-выбарчых сходах, вылучыць на работу ў Саветы больш батрачак, бядначак, колгасьніц і серадначак, дапамагчы ім працаваць у Саветах. Партыйна-савецкія організацыі на мясцох павінны прыняць усе меры да таго, каб павялічыць удзел працоўных жанчын у справаздачна-выбарчай кампаніі саветаў.

У адказ на конт-рэволюцыйную шкодніцкую дзейнасьць верхавіны старой буржуазнай інтэлігенцыі („Прампартыя“, „трудовая сялянская партыя“ і контр-рэволюцыйная інтэлігенцкая група беларускіх нацыянал-дэмократаў), якая накіравана супроць дыктатуры пролетарыяту і да падрыхтоўкі ўзброенай інтэрвэнцыі, працоўная інтэлігенцыя і ўсе культурныя работнікі павінны прыняць самы актыўны ўдзел у справаздачна-выбарчай кампаніі. Працоўная інтэлігенцыя павінна разам з рабочай клясай і бядняцка-серадняцкім сялянствам, пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі, аддаць усе свае веды і сілы на ўзмацненьне саветаў, палепшаньне іх працы, да канца выкрываючы шкодніцкую дзейнасьць агентаў сусьветнага імпэрыялізму ўнутры Савецкай краіны.

Таварышы! Па-ўдарнаму правядзем справаздачна-перавыбарчую кампанію, дамо ў саветы лепшых ударнікаў-пролетараў, батракоў, беднякоў, колгасьнікаў і выпрабаваных серадпякоў. Правядзем справаздачна-выбарчую кампанію саветаў пад знакам пасьпяховага выкананьня бягучых гаспадарча-політычных кампаній і выкананьня заданьняў ударнага кварталу. Перавыбары саветаў павінны прайсьці пад знакам пасьпяховага выкананьня і перавыкананьня плянаў хлебазагатовак і мобілізацыі сродкаў і загатовак ільну, як важнейшых задач выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады.

Па-бальшавіцку выкрыем усе недахопы работы саветаў, каб узьняць на вышэйшую ступень роль органаў дыктатуры пролетарыяту, наблізіць савецкі апарат да вёскі, колгасу, зрабіць яго чоткім, гнуткім і здольным выконваць запатрабаваньні працоўных мас гораду і вёскі. Павядзем жорсткую барацьбу з кулацтвам і буржуазна-нэпманскімі элемэнтамі, якія будуць рабіць спробы скарыстаць у сваіх антысавецкіх мэтах кампанію. Будзем весьці барацьбу з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай, з „левым“ опортунізмам, з двурушніцтвам, права „лявацкім“ блёкам, з прымірэнцтвам да ўхілаў, з вялікарасійскім і іншымі шовінізмамі, з беларускім нац.-дэмократызмам, якія сваёй здрадніцкай работай дапамагаюць ворагам дыктатуры пролетарыяту.

Няхай жыве комуністычная партыя—кіраўнік пераможнага соцыялістычнага будаўніцтва.

Няхай жывуць саветы—органы дыктатуры пролетарыяту.

ЦК КП(б)Б.

Аб права-опортуністычных установках Магілеўскага райкому комсамолу

Рашэньне сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ ад 1-XII—30 году

Абгаварыўшы рашэньне бюро Магілеўскага райкому комсамолу аб рабоце комсамольскай організацыі ў справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў, сэкратарыят лічыць, што побач шэрагу блытаных формулёвак у гэтай пастанове, бюро дапусьціла грубую політычную памылку, орыентаваўшы організацыю, што „клясавая барацьба выклікана нашымі посьпехамі ў соцыялістычным будаўніцтве“, і паглыбіла гэтую памылку тым, што з наяўнасьці клясавай барацьбы робіць вывад толькі аб падрыхтоўцы кадраў савецкіх працаўнікоў“.

Сэкратарыят ЦК констатуе, што такая ўстаноўка не мобілізуе масу на барацьбу за выкананьне задач, пастаўленых партыяй у сувязі з справаздачна-перавыбарчай кампаніяй саветаў, а зьяўляецца яўна права-опортуністычнай.

Выходзячы з гэтага, сэкратарыят ЦК пастанаўляе:

1. Прапанаваць Магілеўскаму райкому адмяніць сваё рашэньне і растлумачыць організацыі права-опортуністычную сутнасьць сваёй пастановы.

2. Прапрацаваць рашэньне партыі і комсамолу па пытаньню справаздачна-перавыбарчай кампаніі і прыняць рашучыя захады па правядзеньню гэтых рашэньняў у жыцьцё.

3. Для растлумачэньня гэтай пастановы камандыраваць у Магілеў т. Гуткіна.

Сэкратар ЦК ЛКСМБ Паляноў.

Карнавал комсамольцаў

Па ініцыятыве Сакольніцкага райкому ЎсеЛКСМ (Масква) 28-XI вечарам быў праведзен комсамольскі карнавал, прысьвечаны перавыбарам саветаў. У карнавале прынялі ўдзел комсамольцы фабрык і заводаў Сакольніцкага раёну.

У карнавале выдзяляліся фігуры шкоднікаў.

На здымку: карнавал комсамольцаў.

ДЭЗОРГАНІЗАТАРАМ НАШАГА НАСТУПЛЕНЬНЯ НЯ МЕСЦА У ПАРТЫІ І КОМСАМОЛЕ

Права-„лявацкім“ атакам на лінію партыі і саюзу комсамол адказвае руйнуючым адпор[ам]

ЗГУРТОВАНЫМІ ШЭРАГАМІ, НА АСНОВЕ ЛЕНІНСКАГА АДЗІНСТВА, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТ[ЫІ] КОМСАМОЛ ІДЗЕ ДА X-га ЗЬЕЗДУ ЛКСМБ і IX УсеЛКСМ

КУЛАЦКІЯ ЗВАНАРЫ

На апошнім зачыненым сходзе комсамольскага колектыву Гомельскай профтэхшколы, пры абгаварэньні вынікаў Кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б, з агіднейшымі паклёпамі і нападкамі на лінію партыі ЦК выступілі комсамольцы Яжоў, Карпман і інш.

Комсамолец Яжоў заяўляе, што „паніжэньне якасьці продукцыі ёсьць вынік націску на колькасьць“. Гора-„тэорэтыкі“— опортуністыя імкнуліся двесьці, што рацыяналізацыя ня можа ісьці далей, што рабочы павінен выконваць навязаны яму прамфінплян, бо інакш „яго павесяць на разгожку“. Гэты агэнт клясавага ворага ў комсамоле, зачыніўшы вочы і заткнуўшы вушы перад сапраўднасьцю, імкнецца ня бачыць таго творчага ўздыму ўсёй рабочай клясы, які закладзен у організацыі рабочымі сустрэчных вытворчых плянаў, соцень ударных брыгад, шырокага разгортваньня соцспаборніцтва і ўдарніцтва, якое перарастае ў вышэйшыя формы—скразныя брыгады, грамадзкі буксір, вытворчыя штурмы і г. д.

Яжоў і Карпман свае выступленьні пачынаюць скаргамі на тое, што ў нас „не хапае цукру“, „паёк рабочага малы“, „чаму яго не павялічваюць“ і г. д. Яны выводзяць з гэтага тэорыю—„рэальная зарплата падае“ і становішча рабочае клясы пагаршаецца. Ідучы далей па гэтым шляху, Карпман заяўляе, што рабочыя „вельмі нездаволены, хоць аб гэтым нідзе ня пішуць“.

Грамадзяне Яжоў і Карпман! Гэтым левым фразёрствам нікога ня зьдзівіце. Контр-рэволюцыйны троцкізм, у барацьбе супроць генэральнай лініі партыі і яе ЦК, выступаў таксама прыкрываючыся фразамі, як-бы абараняючы інтарэсы рабочае клясы, енчыў аб падвышэньні зарплаты і г. д., але партыя і рабочая кляса выкрылі яго сапраўдны контр-рэволюцыйны твар і далі рашучы адпор.

Далей кулацкі агэнт Карпман пытае: —„Хто вінаваты ў фінансавых цяжкасьцях?“ і, не чакаючы адказу, заяўляе:—„Ва ўсім віноўны ЦК і тав. Сталін. Разбуранасьць фінансавай проблемы—ёсьць вынік дрэннага кіраўніцтва ЦК“.

Яжоў, пачаўшы сваю прапанову з нападак на лінію ЦК у гаспадарчых пытаньнях. перашоў на фронт нацкультбудаўніцтва „на ўзьняцьце нацыянальнай культуры мы трацім вялікія сродкі, дык навошта зараз гэта рабіць, лепш разьвіваць культуру інтэрнацыянальную, увесьці мову тэй нацыі, якая зьяўляецца найбольш культурнай“.

Але на гэтым Яжоў не канчае. Ад замаскаванай вялікадзяржаўнай пропаганды пераходзіць да адкрытай. Ён прапануе, каб на Беларусі не праводзілі беларусізацыю, а ўзялі інтэрнацыянальную культуру.

Ня цяжка здагадацца, што гэтыя словы ўзяты з арсэналу махровейшага вялікадзяржаўнага шавінізму.

Яжоў заяўляе, што т. Бухарын мае рацыю ў сваіх установках па нацыянальнаму пытаньню. Але Яжоў ня можа даць яснага адказу, калі яму задаюць пытаньне, што, нарэшце, уяўляюць з сябе ўстаноўкі Бухарына ў нацыянальным пытаньні.

Карпман выступае таксама супроць устаноўкі партыі ў галіне нацыянальна - культурнага будаўніцтва.

Спачатку ён агаварваецца, што ён ня супроць лініі ЦК, але адразу за гэтым дадае: „У нас культура нацменаўская не вырашаецца належнымі тэмпамі. Яўрэйскі хлопец, які жадае займацца на сваёй роднай мове, ня мае магчымасьці, бо няма адпаведных навучальных установаў. А ў гэтым вінаваты ЦК партыі“.

Калі Карпману пачынаюц даводзіць фактамі, што ў БССРы СССР ёсьць сетка навучальных установ на яўрэйскай мове, а таксама і на іншых мовах нацменшасьцяй, ён заяўляе: „я кажу аб Гомелі, што тут недастаткова гэткіх навучальных установ“.

Да характарыстыкі Яжова можна дадаць, што ён меў вымову за дэзэртырства з колгасу, а Карпман таксама прыцягваўся да адказнасьці за яўрэйскі шовінізм.

Ячэйка профшколы мэталістых, замест таго, каб даць рашучы бальшавіцкі адпор „права-лявіцкім“ наскокам на генэральную лінію партыі, адносілася прымірэнча, займалася толькі размовамі, у якіх імкнулася змазаць політычную сутнасьць выступленьня Яжова і Карпмана.

Комсамолец Радзько ў сваёй прамове імкнуўся абараніць тэорыю Яжова і Карпмана, кажучы, што бюро ячэйкі трымае няверную лінію, заціскае самакрытыку і г. д.

Пасьля выступленьня сэкратара ячэйкі, які даў верную політычную ацэнку выступленьням Карпмана і Яжова, большасьць комсамольцаў, прысутных на сходзе, кідалі з месц рэплікі:

„Ты не кажы як сэкратар і член бюро, а выступай, як комсамолец“(?!).

„Пасьля такіх выступленьняў у нас і самакрытыкі ня будзе“.

Яжоў упарта не жадаў прызнаць сваіх памылак, заявіўшы, што за самакрытыку (?) прадстаўнікі Гаркамолу хочуць выключыць яго з комсамолу. А з боку яму падавалі рэплікі: „Ну прызнайся... Прызнайся“—гэта замест рашучай барацьбы.

Ячэйка прафтэхшколы мэталістых паказала, што яна ня здольна як сьлед змагацца за генэральную лінію партыі.

Гомельскі Гарком ЛКСМБ павінен зрабіць жорсткія вывады супроць вылазкі кулацкіх агэнтаў, прымірэнцтва да іх. Бар. ПАЛЕЙ.

Гомель, Гарком. ЛКСМБ.

Не дазволім паклёпнічаць на комсамо[л]

З рэзолюцыі агульнага сходу КСМ К-ву зав. „Энэр[гія]“ Менск

Заслухаўшы інформацыю т. Гуткіна аб рашэньні бюро ЦК ЛКСМБ па поваду заявы Несьцерава і аб дапушчаных памылках членаў бюро ЦК тав. Палякова і Гуткіна, агульны сход колектыву ЛКСМБ заводу „Энэргія“ цалкам далучаецца да пастановы бюро ЦК ЛКСМБ ад 19 лістапада г. г.

Сход рэзка асуджае заяву Несьцерава, якая па сваёй сутнасьці зьяўляецца двурушніцкім, права-опортуністычным паклёпам на комсамол, і патрабуе прыняць рашучыя захады да Несьцерава і яму падобных.

Сход ухваляе рашэньне бюро ЦК ЛКСМБ, якое дало правільную політычную ацэнку гэтай заяве і дапушчаным прымірэнцкім адносінам да гэтай заявы з боку членаў бюро ЦК ЛКСМБ т. т. Паля[кова і] Гуткіна, якія сваю памыл[ку] бальшавіцку прызналі. А[гульны] сход лічыць, што трэба яшч[э] мобілізаваць увесь комсамол[ьскі ко]лектыў на рашучую бара[цьбу з] усялякімі правамі ўхілаў, [асабл]ва з правым ухілам, як га[лоўнай] небясьпекай на даным эта[пе, не] паслабляючы барацьбы з р[эштка]мі контр-рэволюцыйнага троцкіз[му]. Да X зьезду ЛКСМБ і IX УсеЛКСМ прыйсьці яшчэ [больш] згуртаванымі шэрагамі вакол [Ле]нінскай комуністычнай пар[тыі], новымі дасягненьнямі ў наш[ым] будаўніцтве, за выкананьне [пяці]годкі ў чатыры гады.

Няхай жыве Ленінскі ЦК Усе[КП(б)] і яго генэральны сэкратар—[Ста]лін!

Праваопортуністычнай вылазц[ы] далі адпор

18 лістапада на вытворчай нарадзе ліцейнага цэху з кулацкай прамовай выступіў заг. ліцейным цэхам Піотух. Ён заявіў:—„Чаго вы хочаце? Чаго вы ад мяне патрабуеце? Рабочы босы, рабочы галодны. Стаўце вы вашага комуніста і патрабуйце ад яго. Я, як галодны і босы, не магу патрабаваць шмат ад рабочых“.

Прысутныя на паседжаньні партыйцы і комсамольцы, на чале з сэкратаром ячэйкі, не даацанілі політычнай сутнасьці выступленьня кулацкага агэнта Піотуха і не далі яму патрэбнага адпору. І толькі 20 лістапада на бюро партячэйкі, 21 лістапада—на адкрытым партыйна-комсамольскім сходзе ліцейнага цэху і 22-XI—на агульным сходзе рабочых кацельнага, мэханічнага і такарнага цэхаў была рэзка асуджана правае выступленьне Піотуха. Усе рабочыя адна[галосна] прынялі рэзолюцыю, у якой [агуль]ны сход рабочых усіх цэхаў „Энэргія“ з усёй рашучась[цю асу]джае гэтую вылазку, кваліф[ікуючы] яе як контррэволюцыйную. С[ход ра]бочых заяўляе, што вык[ананьне] пяцігадовага пляну ў 4 [гады] стракае на сваім шляху [супра]цьдзеяньне з боку шкодніка[ў і ка]тулянтаў.

— Мы заяўляем, што пя[ці]плян выканаем у чатыры га[ды]... прыкладзем усе нашыя сілы [на вы]кананьне і перавыкананьне фінпляну, ліквідуем былы [прарыў] у кастрычніку, згуртуемся [згуртава]нымі шэрагамі вакол нашай [Ленін]скай комуністычнай партыі, [і пад яе] кіраўніцтвам пойдзем на штур[м но]вых прарываў у наш[ай] творчасьці.

Генькін

М. Югаў.

Вялікадзяржаўная контрабанда пад сьцягам беларускага нацыяналізму*)

„Польшча... (ніякіх клясаў у яго няма, гутарка ўвесь час у Цьвікевіча ідзе аб барацьбе адзінай Польшчы і Расіі)... не хацела аддаць Беларусь Расіі—і таму адзіным выхадам заставалася прызнаньне Беларусі, як самастойнай краіны. Вось чаму мы бачым, што большасьць беларускіх адраджэнцаў таго часу выходзіла з шэрагаў мясцовае інтэлігенцыі польскай культуры“.

Тут ён вымушан прызнаць, уступаючы буржуазным і дробна-буржуазным нацыяналістычным концэпцыям, адну з крыніц „беларускай нацыянальнай ідэі“. Але ён знаходзіць і другую, ня менш важную, крыніцу і сярод так званых беларусаў расійскай культуры. Гэтай крыніцай аказваюцца... „западно-руссы“.

Як ўсім вядома „западно-руссизм“ гэта казённакоштная, поліцэйска-духоўная тэорыя; даказаўшая, што ніякага самастойнага беларускага народа няма, ёсьць толькі мясцовы дыялект, мясцовыя асаблівасьці. „Западно-руссизм“ падкрэсьліваў наяўнасьць гэтых мясцовых асаблівасьцяй толькі ў тэй меры, у якой гэта неабходна было расійскаму прыгоньніцтву для змаганьня з польскім уплывам у культуры, экономіцы, політыцы краю Калі польскі опозыцыйны і рэволюцыйны рух пагражаў тэрыторыяльнай і політычнай цэласьці царысцкай імпэрыі, тады „западно-руссизм“ станавіўся тэй пэдаляй, націскам на якую перадавалася ў масы тая тактыка соцыяльнай дэмагогіі, да якое вымушаны былі зварочвацца расійскія паны: нацкоўваньне беларускіх сялян на польскіх паноў. Гэта небясьпечная і для расійскага буйнога зямляўладаньня гульня на соцыяльных інстынктах масы дапускалася толькі на вельмі невялікі адрэзак часу (пэрыод, напрыклад, мураўёўшчыны—1863—1867 г. г. і строга рэгулявалася царызмам.

„Западно-руссы“ і ўся іх ідэолёгія і ў этай гульні выступалі простай службовай сілай царызму і расійскага прыгоньніцтва: выступаючы супроць буйнога польскага зямляўладаньня, яны спрыялі насаджэньню ў краіне буйного расійскага зямляўладаньня. Іменна іх і разглядае Цьвікевіч, як крыніцу „беларускай нацыянальнай ідэі“. Ён ня можа проста адкінуць факт іх поўнага і бязумоўнага падпарадкаваньня вялікарускаму памешчыку і расійскаму цару, таму ён констатуе недарэчнейшую тэорыю аб „дзьвёх душах“ у „западно-руссизм“—адна цягнула іх да фэтышызаваньня імпэрыі, другая-ж, моў, прымушала іх займацца беларускай этнографіяй, гісторыяй і г. д. А этнографічны інтарэс, выстаўляе ён далей тэзіс, перарастаў у нацыянальны рух.

Цьвікевіч прабуе гэта паказаць на дзейнасьці... Гаворскага, Каяловіча, Сапунова. Усіх гэтых трох дзеячоў „западно-руссизма“ Цьвікевіч прадстаўляе, як абаронцаў інтарэсаў дробнай буржуазіі, абаронцаў дробнай зямельнай уласнасьці. Пра Гаворскага, рэдактара духоўна-чыноўніцкай газэты, у літаральным сэнсе слова поліцэйскага літаратара, даносчыка, прадажнага чалавека, Цьвікевіч піша, што „яго заходнее-руская програма, абапёртая на падтрыманьні беларускага мужыка супроць польскага пана, на прошілежнасьці іх нацыянальных, рэлігійных і соцыяльных інтарэсаў, зьяўляецца парушэньнем асноў соцыяльнага ладу“; прычыны няўдачы справы Гаворскага ён бачыць у тым толькі, што ён праявіў „фальшывы тон у справах „западно-руссизма“—нядбаласьць да мясцовых работнікаў“.

Пра Каяловіча, прафэсара духоўнай акадэміі, супрацоўніка Каткова, Победаносцава, Саблера, буйнога прадстаўніка чорнасоценнага крыла славянафільства, Цьвікевіч піша наступнае: „ён адразу і рашуча схапіў істотную адзнаку соцыяльнага становішча Беларусі—про ілежнасьць інтарэсаў польскага пана-памешчыка і беларускага мужыка-селяніна“. Больш таго, ён пе[р]атварае гэтага заядлага прыганятага русыфікатара ледзь не ў фэдэралістага: „адсюль быў адзін крок да прызнаньня фэдэралістычных ідэй“, ён піша аб „мужыцкім, дэмократычным характары“ заходня-рускай ідэолёгіі Каяловіча.

Пра Сапунова—праўвага акцябрыстага, сталыпінца, члена трэцяліпеньскай дзяржаўнай думы, прышоўшага ў яе ад зьезду зямляўладальнікаў, гісторыка, атрымаўшага за свае навуковыя працы ад самага бацюшкі-цара 500 рублёў, Цьвікевіч піша наступнае: „Сапуноў... заклікаў Беларусь да самаакрэсьленьня, да нацыянальнага ўсьведамленьня, да новай „адроджанай будучыні, якая знаходзіцца ў руках саміх беларусаў. І хоць ён папярэджвае, што гэтае „самаакрэсьленьне Беларусі ніяк не азначае сэпаратызму ад Расіі“ і што „ўзмацненьне нацыянальнай сьвядомасьці“ павядзе толькі да цясьнейшага яднаньня з Расіяй“,—аднак, кожнаму зразумела, што ў даным выпадку Сапуноў, як страус „хаваўся ад праўды за звыклую форму“.

Сэнс усёй гэтай работы па абяленьню і ачышчэньню расійскіх прыгоньнікаў і зьвядзеньню іх да беларускага назоўніка ясны: аўтару трэба паказаць, што „вызваленьне беларускага народу, росквіт беларускае культуры, стварэньне самастойнай Беларусі—усё гэта не знаходзіцца ні ў якай сувязі ні з Кастрычніцкай рэволюцыяй ні з гістарычным рухам пролетарыяту, ні з барацьбой комуністычнае партыі. Усё гэта для Цьвікевіча толькі ўскладняючыя ўмовы, якія перашкодзілі ўсякім чорнасоценным Сапуновым прывесьці беларускі народ да „адроджанай будучыні“.

Політычны сэнс гэтае кнігі заключаўся ў тым, каб апраўдаць політычнае мінулае як самога Цьвікевіча, так і тэй дав лі шматлікай групы служылай беларускай інтэлігенцыі, якая да рэволюцыі, ня маючы нічога агульнага з беларускім нацыянальным рухам, а часамі і змагаючыся з ім, пасьля рэволюцыі далучылася да нацыянальнага руху, жадаючы яго скарыстаць, як адну з форм барацьбы з пролетарскай дыктатурай.

Гэты-ж самы Цьвікевіч, які зараз убіраецца ў тогу ўльтра-нацыяналістага, яшчэ ў ліпені 1917 году, калі цэнтрабежныя імкненьні буржуазна-нацыяналістычных рухаў праявіліся ўжо даволі моцна, на зьезьдзе беларускіх грамадзкіх організацый проста выступіў супроць політычнай аўтономіі для краіны, абараняў, па сутнасьці з-за вялікадзяржаўных інтарэсаў, толькі такую культурна-гаспадарчую аўтономію, якую згаджаліся вы інуць масам, не чакаючы ўстаноўчага Сойму, нават расійскія кадэты. Мы адважваемся напомніць гэтаму фальшываму патрыёту „беларускасьці“ яго прамову:

„Расійская дзяржава, праўда, будавалася захватамі, заваяваньнямі. Але гэты процэс ішоў так доўга, што народы прывыклі ўжо жыць у блізкіх адносінах адны з другімі. Сэпаратыстычныя тэндэн[цыі] надта слабыя. Украінст[ва] рэволюцыйны ўзрыў. Але [з] часам схлыне, бо малых [дзяржаў] цяпер быць ня можа... Н[ам] трэбна аўтономія, як гаспа[дарчае] самакіраваньне, крыху зак[он]скае. Тады ўсё будзе добр[а], хоча наб Расія была моц[най]... [Я] вінен прызнаць патрэбу т[эрыто]рыяльна-гаспадарскай аўто[номіі]. Беларускае Рады быць ня [можа], бо мы занадта бедны с[упроць] Украінай нас раўняць ня [можна]. Што-ж нам трэба рабіць? [Нам трэба] хопліваць зак надаўчых ф[ункцый] а ўзяцца за організаваньн[е]... Інакшай мы сапсуем усю с[праву]“.

(Прамову цытуем па № 10 ...най Беларусі“ ад 30 ліпеня 1917...)

Невыпадкова, вядома, іменна [Цьві]кевіч выступае з кнігай, якая [ста]абярнуць у роданачальнікаў бе[лару]скага нацыянальнага руху [расійскіх] прыгоньнікаў; невыпадкова [ён кан]струе, у мэтадах ідэалізацыі [„дзьвёх] душы“ ў „западно-руссизме“. ... яго політычнага цяперашняга... нуўшага на сябе, у змаганьні... вецкай уладай, рызы абаронц[ы] рускай нацыянальнай ідэі. пры[мушаюць] яго прызнаць, што “западно-ру[ссизм]“ служыў вялікадзяржаўнаму ц[арызму]. Але лёгіка яго політычнага... лага прымушае яго шукаць... пераемных нітак да цяперашняга... на ад „западно-руссизма“.

Вядома, звонку, політычнае м[інулае] Цьвікевіча таксама несумяшчальн[а з] яго політычным цяперашнім, як ва[да і] агонь. Але ўся сутнасьць у тым, [што і] і яго русіфікатарскае мінулае [і] нацыяналістычнае цяперашняе зьяўляюцца зьнэшнім у адносін[ах да] сапраўднага зьместу і мінулага і цяперашняга Цьвікевіча, у адносін[ах да] буржуазна-памешчыцкай сутнасьці... поглядаў, рознастайна афарбаван[ай у] розныя пэрыоды.

(Канец будзе)

*) Працяг. Пачатак глядзі ў № 277.

Шкоднікам ня стрымаць пасьпяховага соцыялістычнага будаўніцтва

У адказ на ўсе спробы замежнай буржуазеі і яе агентаў напасьці на наш Саюз,—пралетарыят Савецкага Саюзу будуе і пабудуе соцыялізм

Лепшым адказам на ўсе вылазкі інтэрвэнтаў і шкоднікаў будзе ліквідацыя прарываў у выкананьні прамфінпляну, барацьба за выкананьне і перавыкананьне пяцігадовага пляну соцбудаўніцтва

Наш адказ шкоднікам

Агенты замежнай буржуазіі, арганізатары крывавай інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу прадсталі перад судом пролетарыяту. Галоўныя абвінавачаныя па справе „прампартыі“ сказалі ў сваіх паказаньнях гаворачы, што: „Наступным момантам, які вёў да абвастрэньня і актывізацыі барацьбы, зьяўляецца пасьпяховы пачатак рэконструкцыі народнай гаспадаркі і пасьпяховы пады... да выкананьня пяцігадовага пляну прамысловасьці. Гэты страх капіталізму перад пяцігодкай, страх і боязнь канчатковага ўзмацненьня савецкай улады, бязумоўна зьяўляецца таксама стымулам для больш рашучых дзеяньняў і больш рашучых наступаў...“

Такім чынам, сусьветная буржуазія ў жаху перад пасьпяховым выкананьнем пяцігодкі, разгортвае барацьбу супроць краіны саветаў, ... новыя крывавыя войны.

З першых дзён Кастрычнікаўскай рэволюцыі пачалася шкодніцкая праца па барацьбе з краінай саветаў. Пасьпяховае будаўніцтва соцыялізму ў нашай краіне выклікала найбольшую актывізацыю варожых элемэнтаў, якія ад прамога шкодніцтва імкнуліся шляхам інтэрвэнцыі зруйнаваць заваёвы Кастрычнікаўскай рэволюцыі.

Лепшым адказам на спробы інтэрвэнтаў і шкоднікаў пасягнуць на заваёвы Кастрычніка будзе перавыкананьне плянаў пяцігодкі, выкананьне яе ў 4 гады.

Буржуазія зразумела, што пытаньне „хто каго?“ ставіцца ў гэтых ва ўсю шырыню:

Або краіна саветаў пабудуе сваю пяцігодку і тады ўжо канчаткова прападуць надзеі на аднаўленьне капіталізму, або крыжовы паход, крывавая інтэрвэнцыя і аднаўленьне ... старых парадкаў.

Але крыжовы паход рымскага папы, інтэрвэнцыя Пуанкарэ—вайны не адбыліся, бо яны пачулі, што межы савецкай краіны зьяўляюцца непрыступнай цытадэльлю і пролетарыят пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі пасьпяхова будуе соцыялізм.

Застаўся адзін месяц ударнага кварталу, пасьля якога пачынаецца трэці рашаючы год пяцігодкі. Комсамольская організацыя павінна мобілізаваць усе свае сілы на ліквідацыю прарываў. Неабходна стварыць новыя штурмавыя ўдарныя брыгады, узьняць вытворчасьць працы, скарыстоўваючы ўсе новыя формы творчай ініцыятывы працоўных для ліквідацыі старых прарываў і пасьпяховай барацьбы за найлепшыя паказчыкі ў выкананьні прамфінплянаў.

Ударнымі брыгадамі, бязьлітаснай барацьбой з лятунствам і рвацтвам, „сталёвымі“ брыгадамі—штурмаваць прарывы, змагацца за прамфінплян —вось наш адказ інтэрвэнтам і ўсім тым, хто думае пасягнуць на заваёвы Кастрычнікаўскай рэволюцыі.

Ударнай брыгадай па шкодніках

У Слуцкай швэйнай арцелі „Труд“ організавалася ўдарная брыгада. Каля 20 чалавек яе складу—старыя рабочыя.

Брыгада выпрацавала статут, вылучыла культгрупы і вытворчую групу, якая павінна сачыць за ўсёй працай.

Р. Кантор.

Радуемся вашым посьпехам

У адказ інтэрвэнтам, чэсныя спэцыялістыя абяцаюць змагацца за пяцігодку

Ад імя фірмы Кагора і ўсіх вямецкіх спэцыялістых, якія працуюць на савецкіх прадпрыемствах, вітаем Вас з адкрыцьцём фабрыкі штучнага шоўку і жадаем далейшых посьпехаў.

Адначасова вітаем усіх рабочых і інжынэраў з дасягненьнямі, якія ў даных умовах выклікаюць у нас самую глыбокую павагу. Рабочыя і інжынэры маюць права ганарыцца гэтымі посьпехамі.

Радуемся, што і мы маглі ўнесьці сваю долю працы і ведаў у гэтую справу, якая будзе каштоўным укладам у будаўніцтве пяцігадовага пляну.

Шчасьлівы, што і ў далейшым маем магчымасьць дапамагчы вам.

Група інжынэраў.

Пералом будзе

Прамфінплян на Магілеўскай швэйфабрыцы за кастрычнік месяц недавыканан на 40.000 адзінак, што складае 60 проц. недавыкананьня.

З 1-га кастрычніка фабрыка перашла на новы асортымэнт. За некалькі дзён да гэтага пераходу трэст павінен быў прыслаць фабрыцы 100 новых швэймашын. Але машыны прыбілі толькі 9-га кастрычніка, ды і то без станкоў.

У цэхах вялувязка. Мэханічны цэх не спраўляецца з працай, дзякуючы чаму штодзённа бываюць прастоі па некалькі гадзін.

У ватным цэху таксама шмат ненормальнасьцяй: пякучасьць, спазьненьні на працу і прагулы падрываюць работу гэтага цэху. Ён павінен выпусьціць у адну зьмену 900 палкладак, а выпускае 650. З-за гэтага ў пашывачным цэху бываюць прастоі.

Дырэкцыя слаба рэагуе на ўсе гэтыя недахопы. Пералом павінен быць і ён будзе.

Гарэлаў.

Бальшавіцкія пляны рэальны

На гомельскай абутковай фабрыцы „Труд“—вялікі пералом.

Калі ў маі месяцы фабрыка выканала прамфінплян усяго на 40 проц. і была пасаджана на чорную дошку, дык гэта тлумачылася тым, што трыкутнік ня здольны быў даць правільнае кіраўніцтва. У той час на фабрыцы былі опортуністычныя выступленьні некаторых комуністых і рабочых, якія стараліся давесьці, што прамфінплян не рэальны.

Як толькі кіраўніцтва было абноўлена, мы пачалі выконваць прамфінплян і давялі яго да 110 проц.

Комсамольскі колектыў мобілізаваў усіх комсамольцаў на барацьбу за прамфінплян. Створана комсамольская рота, рэзэрвныя брыгады. Усе ахоплены соцспаборніцтвам і ўдарнымі брыгадамі.

Жыцьцё паказала, што наш прамфінплян рэальны і выконваецца.

Пасьпяховае выкананьне пляну ёсьць лепшы адказ усім правым ухілістым, якія запэўнівалі нас у яго нерэальнасьці.

За другі год пяцігодкі мы недадалі дзяржаве 10000 пар абутку.

Мы павінны зараз перавыканаць нашы пляны і ліквідаваць запазычанасьць.

Файн-Гольд.

У адказ інтэрвэнтам—ліквідуем прарывы

У час уступленьня ў вытворчыя манэўры прамфінплян на „Чырвонай Бярэзіне“ быў выканан толькі на 97,5 проц. На „Пролетарскай Перамозе“—66,5 проц. Па сядзелях—76 проц., па ватэрпасах—99,5 проц

На фабрыцы „Чырвоная Бярэзіна“ прагулы даходзілі да 50—60, у зьёмачным цэху „Пролетарскай Перамогі“ 12-га лістапада было 97 прагулаў.

Меліся вялікія прастоі, асабліва па віне электрастанцыі. 9-га лістапада фабрыкі стаялі цэлую зьмену з-за недахопу электраэнэргіі.

Недавыпрацавана 3390 скрынак сярнічак і 400 тузінаў ватэрпасаў. Топкі электрастанцыі пабудаваны для работы на рыхлым торфе. Зараз торфу няма, дык топяць дрывамі. Слабыя рашоткі ня вытрымліваюць цяжару і ламаюцца.

Рабочыя пакавальшчыкі ўзялі на сябе абавязкі падняць вытворчасьць на паўтары скрынкі. Скрыначніцы і эцікіровачніцы выпрацоўваюць 6 калоў, замест 5. Яны абяцаюць зьнізіць брак з 4 кілёграм да 3 кілё.

Электрастанцыя арганізавала ўдарную брыгаду манцёраўскіх сьлёсараў.

Юкораўскі пост: Гурэвіч С. Савэльзон Л.

Ударам ударных брыгад адказваем інтэрвэнтам



Ударнікі—энтузіястыя соцыялістычнай будоўлі, барацьбіты за выкананьне прамфінпляну, ліквідацыю прарываў і выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

На здымку: па сярэдзіне—ударнікі за працай. Па бакох—лепшыя ўдарнікі комсамольцы Менскага Чырвонаштандартнага машынабудаўнічага заводу „Энэргія“ т.т. Ахрамовіч і Галадзец.

Не дадалі 46 проц.

У мэханічным цэху чырвонаштандартнага машынабудаўнічага заводу „Энэргія“ (Менск) здарыўся прарыў у недавыкананьні вытворчай праграмы на 46 проц. па выпуску дэталяй.

Адміністрацыя сваечасова не рэагавала на цэхавыя непаладкі. Майстры бюрократычна адносіліся да рацыяналізатарскіх прапаноў рабочых. Рабочы вынайшаў было прыладу для хутчэйшай і лепшай абточкі конічных шасьцяронак, дык знашліся майстры, якія адмовіліся прыняць гэтую прыладу.

Прарыў у такарным цэху пагражае прарывамі ў сьлясарна-зборачным, бо там не хапае дэталяй для зборкі машын.

Сход комсамольскага колектыву, абгаварыўшы становішча заводу і ўдзел колектыву ў барацьбе з прарывам, пастанавіў стварыць скразную ўдарную комсамольскую брыгаду. Ячэйка комсамолу такарнага цэху абвясьціла сябе мобілізаванай на ліквідацыю прарываў.

Нафлег.

Непаладкі душаць прамфінплян

Да Х-га зьезду ЛКСМБ Барысаўскі Райком ЛКСМБ, разам з профсаветам, узяў на буксір завод „Комінтэрн“, які ў апошні час панізіў процант выкананьня прамфінпляну.

Брыгада выявіла шэраг нядбайнасьцяй, якія зрываюць гаспадарчы плян і кідаюць на паветра тысячы рублёў.

9 месяцаў валяецца на двары новы паравы кацёл, а „Цяпло і Сіла“ ў габінэтах усё плянуе. З-за неўстаноўкі катла завод нясе вялікія страты.

Фанера ў прэсах варыцца па адной—паўтары гадзіны, дзе пераходзіць з вышэйшага гатунку „А“ і „АБ“ у гатункі ніжэйшыя, г. зн. няпрыгодныя для экспорту. Такім чынам на кубамэтр фанеры атрымліваецца дэфіцыту 25 проц.—г. зн. 25 рублёў. На гэта ніхто не зьвяртае ўвагі.

Шэраг недапушчальных зьявішч брыгада выкрыла і на другіх аддзяленьнях. 24-га лістапада лесапільная вытворчасьць выканала прамфінплян на 60 проц.

У другім лесапільным аддзяленьні на станку паламаўся болт. Крупілі, вярцелі, рабілі накладку—аказалася непрыгоднай. Потым пачалі рабіць патрэбны болт. На гэта пашло 8 з паловай гадзін, а можна яго зрабіць за 3 гадзіны. Варштат стаяў.

Стэткевіч, Мядзьведзкая.

У адказ шкоднікам

Шпалерная ф-ка ўступіла ў вытворчыя манэўры. Усе рабочыя фабрыкі прымаюць шчыры ўдзел у правядзеньні мерапрыемстваў партыі, змагаюцца за пяцігодку.

Б.

Юрка Лявонны

СОН ПУАНКАРЭ

Калі а поўначы вялізны Парыж
Рэклямы сьвятлом агарталі,—
Лягла па-над Сэнай
Жалезная ціш
Суровых рабочых кварталаў.
У вочах будынкаў гарыць атрапін
І змрок лятуценьні загушкаў:
Гіена баёў
Гэтак сама храпіць
На белых, пуховых падушках...
І сьніцца натхніцелю нэндзы і войн
Надзейнай дварнязе банкіраў:
. . . .
Ляціць ад сталіцы
Па нізкай крывой
Трохколерны сьцяг да Каіра.
Паўсталі зуавы на жорсткі прыгнёт
І чорнымі зданямі лезуць;
Палкоў ня спыніць
Ні штыхом, ні агнём
(Агня не баіцца жалеза!)
На Эйфэля вежы—чырвоны штандар.
З Манмартру ідуць батальёны.
І ўся прэфэктура
Бяжыць праз бульвар,
Кідаючы з-заду праклёны.
А жэрлы гармат ад усіх крэйсароў
Крутнуліся воляй шарніраў—
І з кожнае гавані
Сыпяць знарок
На „ўласных“ панох і банкірах.
Далёка гарматы—
А б'юць у палац!
І, розум згубіўшы ад жаху,
Танцуе з Брыянам Раймонд пад-эспань
На крытым пажарамі даху!
З-пад хваляў і багны ўстаюць маракі.
Даўгімі ручышчамі грозяць:
—Ты сам дамагаўся
Крывавай ракі,
Дрыжы-ж у сьмяротнай трывове!
Ты шкоднікаў слаў на апошні парад,
З кінжалам у кожнай кішэні;
Здаецца—
І табе разьлічыцца пара,
Сусьветны хлусель і машэньнік!
З палёў Лётарынгіі, з Альпаў, Карпат,
Ідуць пахаваныя здані,—
Сьціскаюць за глотку:
—Раймонд! Ты ня рад?!
—Раймонд! Твая гібель за намі!!
Кастром карманьёлы,
Скрозь гулы завей,
Вітае краіна краіну:
—Цягнеце старога шакала хутчэй,
Цягнеце пад нож гільётыны!
. . . .
Падушкі „прэм'ера“—
У халоднай расе.
І лёкаі доўга ня спалі:
Ажно да сьвітаньня па чыстай страсе
Каціліся громы і хвалі,
Ажно да сьвітаньня
Ў жахлівым карэ
Стаялі падзеі ліхія.
... Прысьнілася тое Пуанкарэ,
Што хутка адчуе ў жыцьці ён!

27—XI—30.

4000 подпісаў пад прыгавар

27 лістапада ў Слуцку адбыўся мітынг протэсту супроць дзейнасьці контррэволюцыйнай організацыі „прампартыі“. На мітынгу прысутнічала 4000 рабочых, чырвонаармейцаў, працоўных сялян, вучнёўскай моладзі.

Прысутнічаўшыя на мітынгу патрабуюць суровай кары для шкоднікаў.

У адказ на дзейнасьць наймітаў французскіх інтэрвэнтаў рабочыя будаўніцтва 9 упраўленьня ваенведу, законтрактавалі сябе да канца пяцігодкі.

Рабочыя рашылі дадаткова падпісацца на пазыку „5-годка ў 4 гады“.

Мітынг просіць узнагародзіць АДПУ ордэнам Леніна.

Кантар.

СПРАВА „ПРАМЫСЛОВАЙ ПАРТЫІ“

Слова за словам выяўляецца жудасны малюнак контррэволюцыйнай змовы

„Аддаць заводы прамыслоўцам, зямлю—абшарнікам“—вось чаго жадалі шкоднікі

ПРАЦОЎНЫЯ МАСЫ ПАТРАБУЮЦЬ РАСТРЭЛУ КОНТРРЭВОЛЮЦЫЯНЭРАЎ

Паказаньні падсуднага Ачкіна

Ачкін пачынае з запэўненьня, што ён моцна ўспрыняў Кастрычніцкую рэволюцыю. Пасьля яе ён займаў адказныя пасады. Ён быў членам цэнтральнага кіраўніцтва вугальнай прамысловасьці, потым быў пераведзены ў цёплатэхнічны інстытут. Тут ён сустрэўся з Рамзіным. У „прампартыю“ як ён запэўнівае, уступіў у кастрычніку 1928 году пад уплывам Рамзіна. Тлумачыць гэта тым, што ў палітычных спрэчках Рамзін заўсёды яго біў. Так ён згаджаўся і з пропаведзьдзю Рамзіна аб непазьбежнасьці зьвяржэньня савецкай улады і неабходнасьці інтэрвэнцыі. Тав. Крыленка падводзіць вынік гэтым тлумачэньням.

— Значыцца Рамзін вас ідэолёгічна асядлаў?

Рамзін сьцьвярджае, што сапраўды „апрацаваў“ свайго вучня, прычым настолькі, што ў лістападзе 1928 году ўжо стаў даваць яму адказныя контррэволюцыйныя даручэньні.

— Значыцца,—удакладняе адказ Рамзіна тав. Вышынскі,—вы выкарысталі свой уплыў і аўторытэт, каб зацягнуць Ачкіна ў „прампартыю“?

Рамзін не супярэчыць супроць такой формулёўкі.

Паказаньні падсуднага Сітніна

Па ўласнаму прызнаньню Сітніна, у шкодніцкую арганізацыю ён уступіў з мэтай дабіцца зьмены курсу савецкай улады. Гэта ўступленьне адбылося ў 1925 годзе. Сітнін, бачыце, „жадаў пасставіць савецкую ўладу на шлях дзяржаўнага капіталізму“, на шлях, як ён выражаецца „зьмены-вехаўства“. Сітнін „не супярэчыць“ супроць нацыяналізацыі буйной прамысловасьці, пры захаваньні ў руках прыватнага капіталу сярэдняй і дробнай. Словам, як і ва ўсіх іншых падсудных, у Сітніна —стаўка на буржуазнае перараджэньне савецкай улады. Сітнін выстаўляе сябе і выстаўляў на працягу ўсяго допыту і яшчэ раней, калі ён даваў суду тлумачэньні, праціўнікам інтэрвэнцыі, праціўнікам зьвяржэньня савецкай улады. Але пасьля настойлівых пытаньняў дзяржаўнага абвінавачаньня Сітнін вымушан прызнацца, што ён „устаноўку на інтэрвэнцыю, па сутнасьці, прыняў“. Сітнін заяўляе, што ён лічыў і лічыць савецкую ўладу лепшай з улад у Расіі, а на справе Сітнін—перакананы вораг пролетарскай рэволюцыі, сапраўдны вораг рабочае клясы, сурова гнуў сваю клясавую лінію, усяляк перашкаджаючы росту і разьвіцьцю соцыялістычнай прамысловасьці. Сітнін ня толькі шкоднік, але і хабарнік.

„Гандальпром“ і інтэрвэнцыя

Суд пераходзіць да разгляду пытаньняў, зьвязаных з дзейнасьцю Гандальпрому, і да высьненьня ўзаемаадносін Гандальпрому з прампартыяй. Вычэрпваючыя даныя па ўсіх гэтых момантах паведамляе суду падсудны Рамзін.

Сам Рамзін уступіў у непасрэдную сувязь з прадстаўніком „Гандальпрому“—Рабушынскім у 1927 г., у бытнасьць сваю ў Парыжы. Дырэктыву зьвязацца з Рабушынскім Рамзін перад ад'ездам у заграгічную камандыроўку атрымаў ад Пальчынскага і Хрэньнікава.

Рамзін зноў катэгорычна пацьвярджае, што ён у асабістай гутарцы даведаўся ад Рабушынскага аб тым, што вядзецца падрыхтоўка да інтэрвэнцыі. „Гандальпром“, як перадаў Рабушынскі, вядзе па гэтаму поваду непасрэдныя перагаворы з францускім урадам, карыстаючыся ўплывам і падтрыманьнем Лушэра. Справа пасунулася настолькі далёка, што ўжо ў бліжэйшы час, як запэўніваў Рабушынскі, можна будзе гаварыць аб конкрэтных формах удзелу ў інтэрвэнцыі Францыі, Ангельшчыны і іншых краін. Сярод членаў „Гандальпрому“ пытаньне аб неабходнасьці і мэтазгоднасьці інтэрвэнцыі ня выклікала ніякіх сумненьняў. На той-жа позіцыі стаялі кіруючыя францускія колы. Паміж імі былі разыходжаньні толькі наконт найбольш рацыянальнага тэрміну будучай інтэрвэнцыі. У Гандальпроме схіляліся да думкі аб пажаданасьці адцягнуць некалькі тэрмін інтэрвэнцыі да моманту больш значнага адналеньня прампрадпрыемстваў савецкай улады. Францускія кіруючыя колы, наадварот, адстойвалі неабходнасьць форсіраваньня інтэрвэнцыі, бо з кожным годам узмацнялася абароназдольнасьць Савецкага Саюзу.

Спачатку тэрмін інтэрвэнцыі падганяўся да 1928 г. Рамзін атрымаў ад Рабушынскага дырэктыву ўсямерна форсаваць падрыхтоўку да яе ўнутры краіны. Гэтая падрыхтоўка павінна была забясьпечыць пасьпяховую арганізацыю інтэрвэнцыі звонку. Заданьне Гандальпрому зводзілася агулам да таго, што інжынэрны цэнтр абавязан усе свае намаганьні накіраваць к таму, каб узбудзіць нездавальненьне савецкай уладай у шырокіх масах насельніцтва і стварыць экономічныя цяжкасьці з мэтай забясьпечаньня інтэрвэнцыі.

Другі падсудны, Фядотаў, па таму-ж пытаньню гаворыць:

— Да 1927 г. я да ўсіх гутарак аб інтэрвэнцыі адносіўся звысака, лічыў іх самахвальствам. Потым для мяне стала ясным, што ініцыятыва у пытаньнях інтэрвэнцыі перашла да францускіх колаў і што да гэтых падзей патрэбна сур'ёзна рыхтавацца. У 1928 годзе Гандальпром ужо знаходзіўся ў непасрэдных зносінах з кіруючымі коламі Францыі, і францускі генэральны штаб непасрэдна стаў распрацоўваць програму інтэрвэнцыі. Для гэтага генштаб меў усе падставы, бо к пачатку 1928 г. перагаворы паміж Гандальпромам, Пуанкарэ і Брыянам былі канчаткова афоромлены.

На нарадзе ў Гандальпроме Рамзіну і Ларычаву, які находзіўся разам з ім, было паведамлена, што Пуанкарэ і Брыян рашылі організаваць інтэрвэнцыю і што пры францускім генэральным штабе створана, пад старшынствам генэрала Жанэна, спэцыяльная камісія для распрацоўкі дэталяй яе правядзеньня.

Па хадайніцтву прокуратуры суд пастанавіў далучыць да справы нумар белагвардзейскай газэты „Возрождение“ (ад 7 ліпеня бягучага году), у якім зьмешчан артыкул Рабушынскага з заклікам да „справядлівай вайны“ супроць Савецкага Саюзу.

На далейшым пасяджэньні высьняюцца некаторыя падрабязнасьці, якія адносяцца да генэрала Жанэна.

Францускі генэрал Жанэн — стары „сябра“ савецкай краіны. Яму ў часы „Омскага кіраўніка Калчака“ было даручана камандаваньне саюзнымі вайскамі, якія опэравалі ў Сібіру.

Паказаньні падсуднага Ларычава

Ларычаў указвае, што к моманту нарады ў „Прампартыі“ пачаліся новыя тэндэнцыі. Ужо насьпела неабходнасьць перайсьці да больш „тонкіх спробаў шкодніцтва“. Ад „грубага“ шкодніцтва на прадпрыемствах „прампартыя“ лічыла патрэбным перайсьці ўжо да шкодніцтва зьверху, у пляновых і цэнтральных гаспадарчых організацыях“.

Даклад Ларычава Гандальпрому насіў характар мотывіроўкі неабходнасьці ўжыць гэты новы мэтад. Акрамя таго, на гэтай нарадзе Ларычаў указваў на пажаданасьць пасіліць шкодніцтва ў мэталяпрамысловасьці, што ў найбольшай ступені будзе спрыяць зьніжэньню абароназдольнасьці СССР.

Гэта нарада ў Гандальпроме мела вялікае значэньне ў тым сэнсе, што на ёй канчаткова аформілася кантакт паміж „прампартыяй“ і Гандальпромам, была дасягнута згода аб фінансаваньні „прампартыі“ ў разьмеры 1 мільёна рублёў штогодна, а таксама вызначылася шкодніцкая тактыка „Прампартыі“ ў розных галінах, якая ў далейшым „прампартыяй“ і рэалізавалася.

Суд выклікае ізноў Рамзіна.

На пытаньне дзяржаўнага абвінавачаньня, якія мэты прасьледваліся гэтай нарадай у Гандальпроме і далейшымі спатканьнямі з работнікамі францускага генштабу—Жуанвілем і Рышарам, Рамзін адказвае:—„Я, як адказны кіраўнік „прампартыі“, павінен быў упэўніцца, што інформацыя аб падрыхтоўцы да інтэрвэнцыі адпавядае сапраўднасьці. Неабходна было навочна ўпэўніцца ці так добра організавана падрыхтоўка, як гэта мне абяцалася“.

— Праверыць, ці не надуваюць, ці даволі тоўстыя ў іх кішэні?—пытае Крыленка.

Дзяржаўнае абвінавачаньне просіць суд далучыць да матар'ялаў сьледзтва офіцыйную дэклярацыю Гандальпрому, надрукаваную ў белагвардзейскай варшаўскай газэце „За свабоду“. Дэклярацыя робіць паклёп на АДПУ і бярэ пад абарону шкоднікаў.

Пасьля зачытаньня дэклярацыі да судовага стала адзін за адным падыходзяць падсудныя.

— Я адмовіўся на гэтым процэсе ад абаронцы і тым больш адмаўляюся ад той абароны, якую нам прапануе сваім выступленьнем Гандальпром,—гаворыць Рамзін і далей працягвае.— Усе тыя весткі, якія мы далі адносна ўстанаўленьня сувязі з Гандальпромам і францускім генштабам, зусім адпавядаюць сапраўднасьці. Што-ж датычыць таго, што быццам-бы мы падпарадкаваліся катаваньням у АДПУ, дык наша прысутнасьць тут на судзе і наш выгляд зьяўляецца лепшым доказам хлусьлівасьці сьцьверджаньня Гандальпрому.

Ларычаў заяўляе, што ён цалкам далучаецца да заявы Рамзіна і дадае, што ў адозьве Гандальпрому ёсьць толькі адзін праўільны пункт: гэта там, дзе гаворыцца, што Гандальпром працягвае і будзе працягваць жорсткую барацьбу з савецкай уладай.

— Нас Гандальпром абвінавачвае ў ілжы, гаворыць Фядотаў,—што мы ўсё прыдумалі. Пытаньне,—дзеля чаго? Дзеля ўласнага абвінавачаньня? Гандальпром піша, што нашы паказаньні вымушаны катаваньнем, але я адчуваю сябе ў добрым здароўі.

— Сваю програму дзейнасьці мы будавалі іменна ў адпаведнасьці з дырэктывамі Гандальпрому,—заяўляе падсудны Купрыянаў.

Падсудны Чарноўскі расьцэньвае выступленьне Гандальпрому, як няўдалую і ілжывую спробу апраўдацца

Ачкін сьцьвярджае, што абвінавачваньне супроць органаў АДПУ зьяўляецца гнюснай хлусьнёю. Аб гэтым жа заяўляе і падсудны Сітнін.

Падсудныя просяць суд дазволіць выступіць ім з колектыўным лістам, які абвергне гнюсную хлусьню Гандальпрому.

Пасьля кароткай нарады, спэцыяльная прысутнасьць Вярхсуда знаходзіць апублікаваньне такога ліста лішнім, паколькі падсудныя публічна, ва ўсеўслышаньне адвергслі ўсе заявы, якія былі ў Гандальпромаўскай дэклярацыі.

Паказаньні падсуднага Фядотава

Фядотаў-тыповы прадстаўнік старых інжынэрных колаў. Ад 1905 году ён служыў на Арэхава Зуеўскай фабрыцы Морозава ў якасьці дырэктара.

Пасьля 1905 году падсудны стаў займацца консультацыямі на пабудовах тэкстыльных фабрык. Веў вялікую публіцыстычную дзейнасьць на старонках органу „Профэсарскага бяззубага імпэрыялізму“ (як у тыя часы называлась газэта „Русския Ведомости“) пад псэўд німам „інжынэр“.

— „Належаў да партыі кадэтаў, хаця офіцыйна і ня быў членам ЦК кадэцкай партыі, але меў права дарадчага голасу ў ім...“—адказвае Фядотаў па пытаньні дзяржаўнага абвінавачаньня. Лютаўскую рэволюцыю падсудны спаткаў спачувальна. Кастрычнікаўскую рэволюцыю—„не одобрительно“.

У 1920 годзе падсудны прыцягваецца да адказнасьці па справе „фактычнага цэнтра“, у той час нелегальнага кадэцкага ЦК, але быў вызвален. У 1925 годзе Лапацін прапанаваў падсуднаму ўступіць у аб'яднаньне інжынэраў-тэкстыльшчыкаў.

Сам Фядотаў вымушан прызнаць, што ён вельмі хутка здагадаўся, што крыецца пад гэтымі нявіннымі мэтамі.

Ад'яжджаючы ў маі месяцы 1925 г. у заграгічную камандыроўку, Фядотаў ужо ведаў, што група, членам якое ён зяяўляецца,—ня проста конспірацыйная організацыя, але організацыя проста контр-рэволюцыйная. „У 1927 годзе,—паказвае падсудны,—надзеі на „перараджэньне савецкай улады ня быліся“ Бліжэйшай задачай было пастаўлена зьвяржэньне савецкае ўлады“.

Група шкоднікаў—тэкстыльшчыкаў занялася організаваньнем шкодніцтвам. Фядотаў, па яго словах, прымаў мала практычнага ўдзелу ў шкодніцтве. Але, як буйны спэцыялісты, ён пакідаў групу „каштоўнымі парадамі“ а таксама правядзеньнем шкодніцкіх плянаў у кіраўніцтва ўсе аю... тэкстыльнага сындыкату, дзе ён працаваў.

Тав. Вышынскі жадае высьвятліць якіх палітычных поглядаў трымаўся Фядотаў, будучы членам ЦК „прампартыі“. Стары, заслужаны і падкаваны кадэт не без таго, каб пакрывіцца, адказвае, што менш усяго яму па твару падыходзіла ў той час прытрымлівацца монархічных поглядаў. Рамзін сьцьвярджае:—„Так, Аляксандр Аляксандровіч (Фядотаў), яшчэ раз пацьвярджаю, быў за монархію“.

Цікавым пытаньнем для Фядотава зьявілася пытаньне дзяржаўнага абвінавайца аб куртажы. Аказваецца, па словах Фядотава, што ангельскія фірмы, якія выконвалі савецкія заказы, адлічвалі адзін процант на карысьць белай эміграцыі і чацьвёртую частку проц. на карысьць групы інжынэраў-шкоднікаў. Агулам бела-бандытам перапала 200000 руб., а шкоднікам 50000 руб., з якіх, па ўласнаму прызнаньню, Фядотаў атрымаў „тысячы 3-4“. На пытаньне тав. Вышынскага Фядотаву ці праявіў апошні ініцыятыву пры распрацоўцы ЦК „прампартыі“ дырэктывы аб шкодніцтве ў тэкстыльнай прамысловасьці, Фядотаў даў яскравага адказу. Прышлося выклікаць Рамзіна, які пацьвердзіў, што работа шкоднікаў па стварэньню ... тэкстыльнай прамысловасьці дыспропорцыі, пабудовы непатрэбных фабрык і г. д.—была організавана па ініцыятыве іменна Фядотава.

— Вы не адмаўляецеся?—пытае падсуднага старшыня.

— Я не адмаўляюся. Па маёй ініцыятыве.

Фядотаў садзіцца на масца.

Паведамленьні

На 3 XII а 6-й гадзіне ўвечары ў габінэце Сакратара ЦК ЛКСМБ „Арг. Інструктарскі Аддзел ЦК ЛКСМБ склікае нараду ўсіх прадстаўнікоў ЦК, якія выяжджалі па правядзеньню райконфэрэнцый ЛКСМБ.

Парадак дня:

Інформацыя аб праведзеных райконфэрэнцыях (Інформацыі выяжджаўшых на конфэрэнцыі.

Арг. Аддз. ЦК ЛКСМБ.

ЦКК, ЦСПСБ, Кастрычніцкі і Фрунзэўскі райкомы КП(б)Б і РайКК склікаюць 2-га сьнежня г. г., а 6-ай гадзіне ўвечары, у клюбе Карла Маркса гарадзкі зьлёт рабочых вылучэнцаў, сумесна з сэкратарамі партыйных, комсамольскіх ячэек, старшынямі фабзавмясцкомаў, кіраўнікамі прадпрыемстваў і ўстаноў гор. Менску.

На нараду запрашаюцца рабкоры гор. Менску. На абвестцы дня:

Аб становішчы рабочага вылучэнства і рабоце з вылучэнцамі.

Усім ячэйкам ЛКСМ Койданаўскага раёна

Згодна пастановы ЦК ЛКСМБ 4-ае сьнежня г.г., а 10-ай гадзіне раніцы склікаецца па-за чарговы пашыраны пленум Койданаўскага РК ЛКСМБ.

На пленум павінны зьявіцца члены і кандыдаты РК, рэвкамісіі, конфліктнай камісіі, сэкратары і члены бюро ячэек.

Важнасьць пытаньня прымушае усіх пералічаных абавязкова, своечасова зьявіцца на пленум.

Работа пленума разьлічана на 4 гадзіны гэтага дня.

Сэкратар РК ЛКСМБ Вайнштэйн.

На чорную дошку

Сярод вучняў Вільшчынскай ШКМ Койданаўскага раёну ніякай працы па распаўсюджваньню „Чырвонай Зьмены“ не праводзіцца. З 110 вучняў газэту выпісвае 25 ч. К.

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР РЭДКОЛЕГІЯ

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599